**Рэгламент набору на курсы, выдзялення стыпендыяў на навучанне і правілы ўдзелу ў навучальных праграмах Фонду Вольнага Беларускага Ўніверсітэту**

*Семестр Восень-Зіма 2022/23*

Дадзены рэгламент вызначае крытэры набору на курсы, выдзялення стыпендыяў на навучанне на курсах у форме аплаты кошту навучання, а таксама правілы ўдзелу ў навучальных праграмах Вольнага Беларускага Ўніверсітэту (ВБЎ).

Стыпендыі на навучанне на курсах у форме аплаты кошту навучання забяспечваюцца дзякуючы фінансаванню Еўрапейскага саюзу. Набор удзельнікаў на курсы і выдзяленне стыпендяў ў форме аплаты кошту навучання на курсах, прапанаваных у рамках навучальных праграмаў Вольнага Беларускага Ўніверсітэту, адбываецца на наступных падставах:

- беларускае грамадзянства або сталае жыхарства ў Беларусі;
- узрост ад 21 гадоў;
- вышэйшая, няскончаная вышэйшая адукацыя і ў залежнасці ад курсу - сярэдняя спецыяльная адукацыя;
- грамадска актыўная пазіцыя і матываванасць;
- прыхільнасць ідэям эканамічнай, сацыяльнай і грамадскай трансфармацыі Беларусі дзеля пабудовы вольнага дэмакратычнага і нацыянальна свядомага грамадства, заснаванага на еўрапейскіх каштоўнасцях.

Пункты пры залічэнні на курс:

| | | |
|---|---|---|
| Месца знаходжання | Рэгіён Беларусі | 3 |
| | Мінск | 2 |
| | Іншая краіна | 1 |
| Адукацыя | Вышэйшая | 2 |
| | Сярэдняя | 1 |
| Пол | Жаночы | 2 |
| | Мужчынскі | 1 |

| | | |
|---|---|---|
| Узрост | 21-35 | 2 |
| | 36+ | 1 |
| Матываванасць і ўдзел у грамадзянскіх ініцыятывах і альтэрнатыўных адукацыйных праектах | Матываванасць і досвед удзелу ў грамадзянскіх і адукацыйных ініцыятывах | 3 |
| | Матываванасць і досвед удзелу ў адукацыйных ініцыятывах | 2 |
| | Матываванасць | 1 |

Максімальная колькасць пунктаў - 12. Мінімальная колькасць пунктаў для ўдзелу ў конкурсе - 7.

Рашэнні аб залічэнні на курсы і выдзяленне стыпендыяў на навучанне прымаюцца прыёмнай камісіяй ВБЎ у складзе прадстаўніка(оў) ВБЎ і выкладчыка(цы) адпаведнага курсу на падставе анкетаў кандыдатаў з улікам усіх крытэраў. У выпадку патрэбы ВБЎ будзе індывідуальна кантактавацца з кандыдатам(кай) дзеля правядзення сумоўя. Пры роўнасці пунктаў кандыдатаў канчатковае рашэнне прымае прыёмная камісія па выніках сумоўя. Адабраныя кандыдаты будуць паінфармаваныя па электроннай пошце пра вынікі набору і дату і час пачатку заняткаў. Пасля залічэння на курс залічаныя студэнты падпісваюць Дамову з Фондам ВБЎ, дзе змяшчаюцца палажэнні дадзенага Рэгламенту і акрэсліваюцца правы і абвязкі Бакоў.

З кандыдатаў і кандыдатак, якія адпавядаюць крытэрам ўдзелу ў курсах, а не былі абраныя праз недахоп месцаў, будзе створаны рэзервовы спіс. Асобы з рэзервовага спісу будуць прынятыя ў адпаведнасці з парадкавым месцам у гэтым спісе (паводле колькасці набраных пунктаў) у выпадку адмовы або выдалення са спісу асобаў, залічаных на курс. Асобы з рэзервовага спісу будуць паінфармаваныя па электроннай пошце.

Удзельнік(ца) курсу абавязваецца:

1) удзельнічаць у праграме на ўмовах, акрэсленых у дадзеным Рэгламенце, у прыватнасці, браць удзел і выконваць усе элементы навучання ў рамках абранага курсу;

2) выконваць вызначаны расклад, адказна рыхтавацца да заняткаў і браць актыўны ўдзел ва ўсіх занятках, што ладзяцца ў рамках абранага курсу;

3) спаўняць наступныя тэхнічныя патрабаванні для ўдзелу ў анлайн-сесіях:

доступ да кампутара/ноўтбука з камерай, да інтэрнэту, праца з выкарыстаннем прапанаваных выкладчыкам(цай) прыкладанняў і праграмаў, што выкарыстоўваюцца для правядзення анлайн-заняткаў.

4) удзельнічаць у занятках з уключанай або выключанай камерай у залежнасці ад рэкамендацыяў выкладчыкаў;

5) не запісваць ніякіх заняткаў, якія праводзяцца ў рамках адукацыйных праектаў ВБЎ, без папярэдняй згоды Вольнага Беларускага Ўніверсітэту, выкладчыка(цы) і іншых удзельнікаў(цаў) абранага курсу.

Сістэматычны няўдзел у курсе (больш за 30% прапушчаных заняткаў) і невыкананне яго заданняў азначае аўтаматычнае выключэнне са спісу ўдзельнікаў курсу і атрымальніка стыпендыі. Рашэнне аб выключэнні прымаецца выкладчыкам курсу пасля кансультацыі з адміністрацыяй ВБЎ.

У выпадку неабгрунтаванага спынення ўдзелу ў курсе ўдзельнік(ца) абавязваецца выплаціць Фонду ВБЎ 50% ад сумы стыпендыі ў форме аплаты за навучанне на курсе. Сума, згаданая вышэй, выплачваецца на працягу 14 дзён з даты пісьмовага запыту Фонду ВБЎ адносна выплаты згаданае сумы.